ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 25 (149) 6 лістапада 1990 года

АДБЫЛОСЯ

чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта, дзе разгледжаны наступныя пытанні:

1. Абранне па конкурсу, прысваенне вучоных званняў.
2. Аб выніках дзяржаўных экзаменаў, летняй экзаменацыйнай сесіі і задачах факультэтаў і кафедр па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу.
3. Аб рабоце факультэта грамадскіх прафесій і арганізацыі творчай работы са студэнтамі ва універсітэце.
4. Аб выніках уступных экзаменаў і рабоце факультэтаў па арганізацыі доўгачасовай прафесіянальнай арыентацыі.

Па ўсіх разгледжаных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Якія льготы маюць Ганаровыя донары СССР і БССР на тэрыторыі Гродзенскай вобласці!

(Пытанне ў адрас рэдакцыі)

Спасылаемся на рашэнне № 256 ад 15 кастрычніка 1990 года выканаўчага камітэта Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў, у якім, у прыватнасці, зазначана наступнае.

Рэкамендаваць выканкомам гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў, аддзелу аховы здароўя, упраўленню гандлю аблвыканкома, аблспажыўсаюзу:

— забяспечыць паўнацэннае харчаванне донараў у дзень здачы крыві з вылучэннем у неабходнай колькасці мясных, малочных прадуктаў, шакаладу з улікам наяўных рэсурсаў;

— прыняць да ведама, што, згодна з дзейнічаючым заканадаўствам, кіраўнікі ўсіх ведамстваў, устаноў, арганізацый і гаспадарак павінны бесперашкодна адпускаць рабочых, служачых, калгаснікаў і навучэнцаў ва установы аховы здароўя на час абследавання і ў дзень здачы крыві (прычым у іх захоўваецца сярэдняя заработная плата па месцу работы з усімі дадатковымі выплатамі).

Рэкамендаваць у выпадку здачы крыві ў час адпачынку ці непрацоўны дзень (выхадны або святочны) даваць донару дадатковы аплачваемы дзень адпачынку, водпуск. Ганаровым донарам СССР і БССР па іх просьбе ў вясенне-летні перыяд;

— бесперашкодна адпускаць працоўных і служачых ва установы аховы здароўя ў дзень абследавання і ў дзень здачы крыві для пералівання і захоўваць за імі на час знаходжання ў гэтых установах сярэднюю заработную плату па месцу работы.

Аддзелу аховы здароўя аблвыканкома сумесна з фінансавым упраўленнем аблвыканкома разгледзець пытанне аб павелічэнні з 01.01.91 г. норм грашовых расходаў для аплаты харчавання аднаго бязвыплатнага донара з 1 руб. 38 кап. да 2 руб. за кошт выдзялення дадатковых сродкаў службе пералівання крыві з абласнога бюджэту.

Рэкамендаваць аддзелу аховы здароўя аблвыканкома разгледзець пытанне першчарговага абслугоўвання Ганаровых донараў СССР і БССР у амбулаторна-паліклінічных установах, пазачарговую гаспіталізацыю, пазачарговы выраб і рамонт зубных пратэзаў, уключаючы і пратэзаванне з дарагіх металаў, першачарговае забеспячэнне медыкаментамі, а ў асобных выпадках — пратэзамі і пратэза-артапедычнымі вырабамі.

Прасіць Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР вырашыць пытанне аб прадстаўленні права Ганаровым донарам СССР і БССР на пазачарговае набыццё білетаў на авіяцыйны, чыгуначны і аўтобусны транспарт на тэрыторыі рэспублікі.

Рэктарам і дырэктарам вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў устанавіць донарам-студэнтам, якія бязвыплатна далі кроў не менш 10 разоў, бясплатны праезд на грамадскім транспарце па горадзе за кошт бюджэтаў навучальных устаноў.

Зноў перамога!



У кастрычніку ў сталіцы Італіі г. Рыме праходзіў чэмпіянат свету па класічнай барацьбе. У саставе зборнай Савецкага Саюза выступаў наш зямляк, студэнт другога курса факультэта фізічнай культуры універсітэта, майстар спорту міжнароднага класа, неаднаразовы чэмпіён СССР, чэмпіён Еўропы Аляксандр Шастакоў.

Выйграўшы ўсе папярэднія сустрэчы ў вагавай катэгорыі 57 кілаграмаў, Аляксандр сустрэўся ў фінале са спартсменам з Германіі. У роўнай барацьбе суддзі аддалі перавагу германскаму барцу. У выніку, Шастакоў у другі раз на чэмпіянаце свету заваяваў сярэбраны медаль.

Гэты поспех па праву раздзяляе заслужаны трэнер СССР, загадчык кафедры фізічнага выхавання універсітэта Аляксандр Аляксандравіч Максімовіч — ён паспяхова трэніруе спартсмена.

Трэба сказаць, што гэты год для Аляксандра Шастакова складваўся няўдачна. Яго праследавалі траўмы. Таму спартсмен не прымаў удзелу ў чэмпіянатах Савецкага Саюза і Еўропы. Аднак, пераадолеўшы ўсе цяжкасці, Аляксандр здолеў падрыхтавацца да чэмпіянату свету і быў уключаны ў састаў зборнай Савецкага Саюза.

Цяпер Шастакоў разам са сваім таварышам па зборнай, студэнтам факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта, майстрам спорту Шамсадзінам Аббасавым і выкладчыкам кафедры фізічнага выхавання Анатолем Федарэнка прымае ўдзел у міжнародным турніры па класічнай барацьбе, які праходзіць у Турцыі.

Ад усёй душы віншуем Аляксандра з поспехам на чэмпіянаце свету і жадаем яму далейшых спартыўных дасягненняў.

І. БЕЛАВОКІ,
старшыня спортклуба універсітэта.

НА НОВЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

РАЗЛІЧВАЕМ НА ПАДТРЫМКУ

Рашэнне аб адкрыцці інжынернага факультэта ў нашым універсітэце было прынята ў чэрвені гэтага года. Аднак, трэба зазначыць, што рашэнню гэтаму папярэднічала вялікая арганізацыйная, навукова-даследчая, вучэбна-метадычная работа.

Першы выпуск па спецыялізацыі «Радыёфізіка і электроніка» быў, дарэчы, яшчэ ў 1983 годзе. На працягу мінулых сямі гадоў — нанава створаны і мадэрнізаваны вучэбныя і навуковыя лабараторыі кафедр радыёфізікі і электронікі, прыкладной оптыкі, створаны калектывы выкладчыкаў і супрацоўнікаў гэтых кафедр, склаліся тэматыка навуковых даследаванняў, цесныя дзелавыя кантакты з рознымі навучальнымі і навуковымі установамі краіны.

Яшчэ раней склалася вытворчае аддзяленне фізічнага факультэта, на якім ажыццяўлялася падрыхтоўка спецыялістаў спачатку на аснове індывідуальных планаў са спецыялізацыямі, а з 1989 года па вучэбных планах інжынерных спецыяльнасцей «Радыёфізіка і электроніка» і «Аптычныя прыборы і сістэмы». Адкрыццё гэтых спецыяльнасцей ва універсітэце звязана з хуткім развіццём у рэспубліцы, рэгіёне навукаёмкіх вытворчасцей, патрэбай прадпрыемстваў, навучальных устаноў, навукова-вытворчых падраздзяленняў у спецыялістах інжынерна-тэхнічнага профілю. Такое сцвярджэнне на сённяшні дзень умацавана ўстойлівымі заказамі прамысловых прадпрыемстваў на аснове дагавораў на мэтанакіраваную падрыхтоўку аж да 1997 года. Наяўнасць такіх дагавораў дазволіла з 1990 года пачаць падрыхтоўку па спецыялізацыі «Метралогія і метады кантролю» на адкрытай у 1989 годзе кафедры інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі. Такім чынам, наяўнасць дагавораў у значнай ступені дазваляе вырашаць некаторую частку праблем, якія, несумненна, узнікнуць пры пераходзе да рыначных адносін.

Тым не менш, тое, што зроблена,— гэта вельмі нязначная частка таго, што яшчэ трэба будзе зрабіць на факультэце ў самы бліжэйшы час і ў перспектыве для таго, каб мець магчымасць хутка рэагаваць на запатрабаванні заказчыкаў, адаптыравацца ў выкладаемых дысцыплінах. Ва ўмовах канкурэнцыі многіх навучальных устаноў на заключэнне дагавораў на падрыхтоўку спецыялістаў, па правядзенню навуковых даследаванняў, асабліва ў інжынерна-тэхнічнай вобласці, неабходна змяніць усю сістэму падрыхтоўкі на інжынерным факультэце ГрДзУ. Гэта магчыма пры ўмове шырокага выкарыстання ў навучальным працэсе навейшых дасягненняў інфармацыйных тэхналогій: аўтаматызаваных дыялогавых навучальных сістэм, інфармацыйна-пошукавых сістэм; у выніку пошуку і выкарыстання ў вучэбным працэсе нетрадыцыйных форм навучання: дзелавых і імітацыйных гульняў і іншых.

Старыя, выпрабаваныя формы навучання — лекцыя, практычныя заняткі, якія вычарпалі сябе, ці даўно ўжо не адказваюць узроўню патрабаванняў сённяшняга, а тым больш заўтрашняга дня, павінны быць выціснутымі рознымі формамі індывідуальнай работы са студэнтамі, самастойных пошукаў. Дапаможнікам у гэтым застанецца выкладчык, а інструментарый — ЭВМ, кніга, лабараторная ўстаноўка, макет і г. д.

Такая пастаноўка адлюстроўвае тыя праблемы, якія стаяць перад інжынерным факультэтам універсітэта, яго супрацоўнікамі. А тут і адсутнасць плошчаў, новага сучаснага абсталявання, сродкаў вылічальнай тэхнікі, недастатковая колькасць спецыялістаў літаратуры, перыядычнасць выданняў па інжынерна-тэхнічных напрамках радыёэлектронікі, аптычнага прыборабудавання і нестабільнае становішча прамысловых прадпрыемстваў, якія не ведаюць, як функцыяніраваць у новых умовах.

Трэба сказаць, што рашэнне гэтых праблем не толькі нашага факультэта магчыма пераважна на аснове эфектыўнай, добрасумленнай працы ўсіх супрацоўнікаў і выкладчыкаў, адказных адносін да сваёй працы студэнтаў.

Факультэт, безумоўна, разлічвае на дапамогу і падтрымку рэктарата, вучэбнага аддзелу, усіх службаў і падраздзяленняў універсітэта.

Ю. БЕЙЦЮК,
выконваючы абавязкі дэкана інжынернага факультэта, кандыдат тэхнічных навук.

ПЕРШАКУРСНІК ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

ПЕРШЫЯ КРОКІ, ПЛАНЫ,

ХТО ЁН, ПЕРШАКУРСНІК?

Аб гэтым наша гутарка з адказным сакратаром прыёмнай камісіі дацэнтам **Я. А. Роўбай**.

— Яўген Аляксеевіч, чым адрозніваліся ўступныя экзамены ў гэтым годзе ад, скажам, папярэдніх?

— Правілы прыёму ў асноўным былі ідэнтычнымі тым, якія дзейнічалі ў мінулым годзе. Зазначу толькі, што сёлета ўпершыню мы залічылі трох студэнтаў без уступных экзаменаў, яны пражывалі ў раёнах строгага радыяцыйнага кантролю і скончылі дзесяцігодку без троек.

Некалькі слоў аб ФДП, які працаваў пры універсітэце. Упершыню слухачам ФДП, якія здалі выніковы экзамен (профільны на абраным факультэце) на «5», гэты экзамен быў залічаны як уступны. Але неабходна яшчэ ўдасканальваць арганізацыю і правядзенне выніковых экзаменаў на ФДП з тым, каб пасапраўднаму аб'ектыўна вызначаць веды слухачоў.

Дарэчы, у гэтым годзе 60 абітурыентаў былі вызвалены ад уступных экзаменаў (здавалі выніковыя экзамены на ФДП, камісіі ў сваёй школе, улічваліся таксама адзнакі настаўнікаў-наватараў, не здавалі ўступных экзаменаў і прызёры алімпіяд). Дарэчы, усе гэтыя 60 абітурыентаў — медалісты. Усяго ж паступала ва універсітэт 410 медалістаў, паступіла — 250, гэта амаль кожны трэці першакурснік. Усяго ж было пададзена 2094 заявы пры плане набору 850 чалавек (улічваючы і падрыхтоўчае аддзяленне).

— А на якіх факультэтах конкурс быў асабліва высокі?

— Ён у цэлым быў вышэйшы, чым у мінулым годзе. Асабліва — на факультэце правазнаўства: на 100 запланаваных месц было пададзена 378 заяў, з іх 100 — медалістамі. Таксама вялікі конкурс назіраўся на вытворчым аддзяленні матфака, факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Узрос конкурс і на філфаку. І ўпершыню колькасць абітурыентаў перавысіла 2000 чалавек.

— А калі ацэньваць якасць ведаў абітурыентаў?

— З упэўненасцю магу сказаць, што ў апошні час значна палепшыўся агульнаадукацыйны ўзровень тых абітурыентаў, якія паступаюць на стацыянар. Як ужо адзначалася вышэй, павялічылася колькасць медалістаў, выпускнікоў ФДП, спецкласаў сярод абітурыентаў. І не дзіўна, што многія з іх сталі студэнтамі. Нельга не сказаць і аб карысці двухтыднёвых курсаў, якія арганізуюцца ва універсітэце перад уступнымі экзаменамі. Вучыліся там 761 чалавек. Большасць з іх залічана студэнтамі ў выніку экзаменаў.

Што датычыцца абітурыентаў, якія паступілі на завочнае аддзяленне, то тут справы не так ужо і радуюць. Заяў было дастаткова: 880 на 389 свабодных месц. Калі ж закончыліся ўступныя экзамены, мы змаглі адразу, па выніках ўступных экзаменаў, сфарміраваць кантынгент толькі па двух спецыяльнасцях: біялогіі і рускай мове і літаратуры. Многія абітурыенты, якія паступалі на завочнае аддзяленне, экзаменаў проста не вытрымалі. Адным словам, адчувалася нізкая, павярхоўная падрыхтоўка многіх абітурыентаў. Вывад напрошваецца такі: неабходны ўвесь даволі багаты арсенал сродкаў, які мы маем у арганізацыі работы са школьнікамі па падрыхтоўцы іх да экзаменаў у ВНУ, прымяняць у адносінах да працуючай моладзі, якая жадае ў нас вучыцца на завочным аддзяленні. А, калі гаварыць у цэлым аб гэтай рабоце, у перспектыве — пашырэнне практыкі ўліку выпускных экзаменаў на ФДП у школах вобласці, як уступных, і пашырэнне льгот выпускнікам ФДП пры паступленні, удасканаленне сістэмы комплекснай экспрэс-дыягностыкі прафесіянальнай прыгоднасці кандыдата на педагагічную прафесію з тым, каб у наступным годзе больш шырока выкарыстоўваць яе пры паступленні абітурыентаў.

— А што б Вы пажадалі першакурснікам?

— Вядома, што першы курс — нялёгкі. Тут і вядомая псіхалагічная нагрузка (хлопец ці дзяўчына ад сям'і, сяброў трапіў у абставіны, калі трэба ўсё часцей прымаць самастойныя рашэнні). Да таго ж першакурсніку даводзіцца ўспрымаць вялікую колькасць самай рознай інфармацыі, якую неабходна засвоіць. Хацелася б пажадаць, каб яны як мага больш паспяхова прайшлі гэты адказны і складаны этап. Вельмі многае залежыць ад выкладчыкаў. У іх сілах зрабіць так, каб ніводны першакурснік не быў пакінуты без увагі, мог разлічваць на дапамогу, падтрымку.

Сярод пэўнай часткі абітурыентаў мы праводзілі анкеціраванне. Яно ў выніку паказала, што многія першакурснікі валодаюць добрымі педагагічнымі і чалавечымі якасцямі. Было б добра, каб за гады вучобы ўсё гэта не толькі не страцілася, але і памножылася.

АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

ПРА ТОЕ, ШТО НАПЕРАДЗЕ...

Вітанне вам, сябры-першакурснікі! Вы зараз нагадваеце нечым зусім жаўтаротых спадарожнікаў, якія толькі ў пачатку свайго шляху ў вялікую і вельмі цікавую краіну пад назвай студэнцтва. Рознакаляровы букет з прыемных віншаванняў і парад у кароткі тэрмін некалькі супакоіў вас. Родныя і сябры, перахваляваўшыся ў свой час за вас, цяпер з захапленнем і гонарам гатовы выконваць любое ваша пажаданне. Усё гэта добра. Але сямейныя радасці — зусім невялікая прыступка да універсітэта і яго жыцця. Больш значны крок вы зрабілі 1 верасня, калі атрымалі сімвалічны ключ у краіну ведаў, залікоўку і студэнцкі білет. А вось далей вас чакае больш сціплая рэчаіснасць.

Хачу адразу папярэдзіць: усё, што вы зараз прачытаеце, не трэба ўспрымаць вельмі сур'ёзна. Яшчэ раз звярніце ўвагу на назву артыкула. Мой артыкул [illegible] характар. У ім я трэба вучыцца весела.

Праз месяц-другі вы як след пазнаёміцеся з жыццём універсітэта. І ўжо не будзеце блытаць будынак гістфака з біяфакам. Запомніце размяшчэнне аўдыторый у корпусе, прозвішчы выкладчыкаў.

А наведацца ў камітэт камсамола і прафкам універсітэта вам давядзецца яшчэ хутчэй. У бібліятэках вы атрымаеце неабходныя падручнікі і, калі пашанцуе, спакойна будзеце займацца два-тры тыдні. А ў гэтым вам не пашанцавала. Але галоўнае наперадзе. Не паспелі вы надыхацца па-сапраўднаму паветрам заняткаў, як вас паклікала галоўнае падарожжа на сельгасработы.

О, бульба! Ніхто так не ўмацоўвае дружбы і не робіць ворагамі як ты! Тут ужо адразу стане вядома, хто ёсць хто на самой справе і чым дыхае, атрымаецца з вас сапраўдны калектыў ці студэнтамі і канчаткова імі станеце ў дзень пасвячэння ў першакурснікі. З адной, праўда, агаворкай: да першай сесіі. Пакуль экзаменатары не спішуць першы аркуш вашай залікоўкі.

З першых дзён вы павінны акунуцца ў студэнцкае жыццё.

Спачатку наведванне лекцый будзе амаль стопрацэнтным, у параўнанні з астатнімі курсамі. Дэканат запэўніць вас, што калі так пойдзе далей, то ваш курс стане самым лепшым. Але не прымайце ўсё гэта ўсур'ёз. Такая гаворка адбываецца кожны год. А стаць лепшым не так проста, як вам здаецца. І, акрамя ўсяго іншага, вы яшчэ як след не пазнаёміліся са студэнтамі старэйшых курсаў, а ў іх заўвагах і парадах, расказах аб студэнцкім жыцці вас чакаюць не менш ашаламляльныя адкрыцці. Вы раптам даведаецеся, што гісторык, які чытае ў вас лекцыі, зусім не такі строгі на экзаменах, як зараз сябе паказвае, а па многіх тым, што гавораць вашы прафесары, нельга ўгнацца. Словам, вам раскажуць шмат таго, аб чым раней вы і не здагадваліся. А аднойчы, праспаўшы першую пару лекцый, вы потым ужо не будзеце так хваляваца, бо добра стане вядома, што матэматык зусім на гэта не злуецца. Вы даведаецеся, з кім з выкладчыкаў можна па-сяброўску паразмаўляць у час экзамену, а каго трэба і баяцца. А яшчэ вы даведаецеся, што з другога курса, калі вы паспяхова разлічыцеся з першым, вас чакае вольнае наведванне заняткаў. Гэта добрая справа толькі для Учора і Сёння, а для Заўтра — не вельмі. Не вельмі таму, што наперадзе (заўтра) будзе сесія. Таму не спяшайцеся крычаць «Ура!», не жывіце толькі сённяшнім днём, падумайце пра Заўтра. Якім яно стане для вас і ці пойдзе на карысць вам вольнае наведванне. На старэйшых курсах паабяцаюць яшчэ адзін вольны дзень, для самастойнага вывучэння ма[illegible] тэрыялу, у гэты ж дзень вас мож[illegible] запрасіць на індывідуальную гу[illegible] тарку выкладчык. З самага па[illegible] чатку за кошт гэтага дня ў ва[illegible] павялічыцца нагрузка сярод тыд[illegible] ня. Але не засмучайцеся, з усі[illegible] гэтым вы хутка звыкнецеся.

Заўважана, што больш хутк[illegible] ўцягваюцца ў студэнцкае жыцц[illegible] тыя, хто засяляюцца ў інтэрнаты. У іх гартуецца сапраўдны сту[illegible] дэнцкі характар. Чаго кашту[illegible] толькі адно засяленне ў інтэрна[illegible] у пачатку кожнага навучальнаг[illegible] года, а потым бясконцыя перас[illegible] ленні з аднаго пакоя ў другі! [illegible] з гэтым, мой сябра — перш[illegible] курснік, табе давядзецца суты[illegible] нуцца.

Праз усё гэта ты хутка аб[illegible] вязкова пройдзеш. А пакул[illegible] што — у добры шлях, друж[illegible] першакурснік! І няхай ніколі [illegible] цябе не губляецца пачуццё гум[illegible] ру да сябе і знаёмых, а залікоў[illegible] поўніцца добрымі адзнакам[illegible] Я віншую цябе з паступленнем [illegible] пачаткам заняткаў!

Фотарэпартаж В. Сарокіна

Урачыстасць

Спачатку яны рабілі выбар. Нехта даўно ўжо вырашыў паступаць ва універсітэт, іншыя ж ставілі пытанне: куды ісці вучыцца? І таксама прыйшлі сюды.

А якая складаная потым была барацьба! Вытрымалі яе, будзем спадзявацца, лепшыя, больш падрыхтаваныя, мэтанакіраваныя хлопцы і дзяўчаты. Іх сёлета 800.

Першага верасня, у Дзень ведаў, нашых першакурснікаў па добрай традыцыі віталі выкладчыкі, дэканы факультэтаў. Вядома, ад душы жадалі творчай працы, спадзяваліся, што будзе яна плённай, цікавай, абавязкова прынясе задавальненне. Гаварылі аб багатых традыцыях універсітэта і яго калектыву, аб тых зменах, якія адбыліся ў апошнія гады, аб тым, што чакае сённяшняга першакурсніка ў заўтрашнім самастойным жыцці.

ПЕРШАКУРСНІК ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ

ІМКНЕННІ

Уражанні?

Яны такія...

Закончылася працоўная вахта па ўратаванню ўраджаю бульбы, і нашы першакурснікі прыступілі, нарэшце, да вучобы.

Цікава, як яны сябе адчуваюць, што скажуць аб першых сваіх уражаннях!

Такім чынам, нашы новыя знаёмыя — студэнты-першакурснікі 1-й групы фізічнага факультэта.

Сяргей Квачан. Інфарматыка — мой любімы прадмет яшчэ са школы. Пачатак на шляху да прафесіі зроблены — гэта ўжо радуе.

Уражанні? Увогуле, добрыя. Зазначу толькі, што універсітэт — не школа. З першых дзён пераканаўся, што праца наперадзе нялёгкая. Пакуль што застаецца толькі спадзявацца на тое, што неўзабаве нава матаналіз ужо не будзе здавацца такім недасягальна грозным... Адным словам, да барацьбы гатовы.

Аляксей Сялюгін. Праграма навучання ва універсітэце, у прыватнасці, на нашым факультэце, шырокая. Зразумела, што гэта неабходна для таго, каб спецыяліст быў усебакова падрыхтаваным. Але ж па меркаванню выпускнікоў, тых, хто працуе ў школе, веды маглі б быць і больш канкрэтнымі. Адным словам, вельмі хацелася б, каб усё тое, чаму навучыліся ў сценах універсітэта, спатрэбілася ў рабоце з дзецьмі. Бо веды ведамі, а пакуль што выпускнік вельмі спадзяецца, што ў школе яму пашанцуе, калі сустрэне там вопытнага, творча працуючага настаўніка.

Наталля Трус. Да паступлення ва універсітэт рыхтавалася даўно. Завочна займалася на ФДП. Выпускны экзамен па фізіцы здала на «пяць». Адзнака была залічана, і ўступнага экзамену па гэтаму прадмету я не здавала.

Лічу, што, каб паспяхова вучыцца тут, абавязкова патрэбна добрая школьная падрыхтоўка. З першых дзён стала ясна: праграма навучання складаная. Трэба шмат працаваць. Вельмі патрэбна нам разуменне з боку выкладчыкаў, асабліва цяпер, у пачатку вучобы. Добра было б не проста слухаць лекцыі, а па меры магчымасці удзельнічаць у дыялогу з выкладчыкам. Нават па матаналізу, у якім пакуль што толькі адно незразумелае! Хаця ж такі дыялог у хуткім часе нас чакае. На экзаменах і заліках у зімовую сесію. І яшчэ маленькая заўвага — з усёй групы толькі 7 чалавек жывуць у студэнцкім інтэрнаце, астатнія — хто дзе...

Наталля Бойка. Я скончыла Лявонавіцкую дзесяцігодку, што ў Дзятлаўскім раёне. Усё навучанне ў нас вялося на роднай мове. Дарэчы, у час уступных экзаменаў на ёй я пісала і сачыненне на тэму «Беларусь мая партызанская». На жаль, ва універсітэце па-беларуску гавораць вельмі нямногія.

Першыя ўражанні нядрэнныя. Спадзяюся, што група наша будзе дружнай, згуртаванай. Разам заўжды лягчэй перамагаць цяжкасці.

Марына Марышэўская. Настаўнікам марыла стаць, як толькі пайшла ў школу. З 7-га вучылася ў спецкласе па фізіцы. А як выкладаў яе наш любімы настаўнік! Зразумела, вельмі цікава і нават весела!

Ва універсітэце атмасфера некалькі іншая. Ды і зразумела: тут вунь колькі студэнтаў на аднаго выкладчыка! Але вельмі хацелася б, каб яны, па-першае, з самага пачатку лічылі нас за асоб, якіх трэба (ды і ёсць за што) паважаць, імкнуліся да дыялогу з намі, а мы пастараемся яго падтрымліваць. Час ляціць хутка, не за гарамі — першая экзаменацыйная сесія. Хачу пажадаць сябрам поспехаў!

Надзвычай урачысты момант у жыцці першакурснікаў — уручэнне студэнцкіх білетаў і залікових кніжак.

З хваляваннем слухае будучы матэматык Кацярына Мікевіч шчырыя словы віншавання, з якімі звяртаецца да яе ў гэтыя хвіліны дэкан матфака Лідзія Уладзіміраўна Кірылюк. Жадае поспехаў у вучобе, сяброўства, цікавага, насычанага студэнцкага жыцця.

Уважлівыя твары. У вачах — цвёрдасць, вера ў поспех, у тое, што нялёгкі шлях да прафесіі будзе пройдзены паспяхова.

У добры шлях, першакурснік!



ЮРЫДЫЧНАЯ ДАВЕДКА

— Ці прымае ўдзел студэнцкая група ў размеркаванні месц у інтэрнаце?

— Так, безумоўна, калектыў студэнцкай групы ўносіць прапановы ў прафком і студэнцкі савет аб размеркаванні месц у інтэрнаце, пасяленні ў ім студэнтаў.

— У якім парадку назначаецца і вызваляецца стараста студэнцкай групы?

— Калектыў студэнцкай групы выбірае старасту, прымае рашэнне аб вызваленні яго ад абавязкаў і выходзіць з прапановай у дэканат аб зацвярджэнні прынятага рашэння.

— Як абавязаны паступіць студэнт у выпадку пропуска вучэбных заняткаў?

— Ва ўсіх выпадках студэнт абавязаны растлумачыць прычыну адсутнасці. Пры няяўцы на вучэбныя заняткі па ўважлівых прычынах студэнт абавязаны не пазней чым на наступны дзень давесці да ведама дэкана факультэта і ў першы дзень з'яўлення на занятках прадставіць у дэканат пацвярджэнне ўважлівай прычыны адсутнасці. Аб захворванні павінна быць прадстаўлена даведка ўстаноўленага ўзору з адпаведнай лячэбнай установы.

— Ці абавязаны студэнт пры здачы экзамену або заліку па грамадскіх навуках прадстаўляць канспект твораў класікаў марксізма-ленінізма?

— Кафедры грамадскіх навук абавязаны ствараць неабходную метадычную базу для вывучэння студэнтамі прац К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, вучыць студэнтаў складаць канспекты і карыстацца імі. Аднак патрабаванне абавязковага прадстаўлення канспектаў пры здачы экзаменаў і залікаў па грамадскіх дысцыплінах з'яўляецца неправамерным.

— У якім выпадку студэнт можа быць вызвалены ад здачы заліку, экзамену па грамадскай дысцыпліне?

— Загадчык кафедры грамадскіх навук па прадстаўленню выкладчыка, які вядзе вучэбныя заняткі, можа вызваліць студэнтаў, паказаўшых выдатныя веды на семінарах і гутарках, ад здачы залікаў і экзаменаў, выстаўляючы ім адзнаку «выдатна».

— Ці дапускаецца ў час экзаменаў карыстацца дапаможнай літаратурай?

— Студэнты маюць права ў час экзамену карыстацца вучэбнымі праграмамі, а з дазволу экзаменатара — дапаможнай літаратурай і іншымі дапаможнікамі.

— Якая колькасць экзаменаў можа быць вынесена на экзаменацыйную сесію?

— На адну экзаменацыйную сесію дапускаецца вынясенне да пяці экзаменаў.

— Ці дапускаецца ўмоўны перавод студэнтаў, якія маюць акадэмічную запазычанасць, на наступны курс?

— Умоўны перавод студэнтаў ВНУ, якія маюць акадэмічную запазычанасць, на наступны курс забаронены.

ЧАКАЕМ, СПАДЗЯЁМСЯ НА СЯБРОЎСТВА!

Паважаны першакурснік!

Рады вітаць цябе ва універсітэце студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі.

Спадзяёмся, што гады, якія ты правядзеш побач з намі, будуць плённымі, прывядуць да жаданага поспеху, здзяйснення задуманага.

Ва універсітэце створаны для гэтага добрыя ўмовы. Чакаюць цябе:

БІБЛІЯТЭКА;

НАВУКОВЫЯ ЛАБАРАТОРЫІ З АБСТАЛЯВАННЕМ І ВЫЛІЧАЛЬНАЙ ТЭХНІКАЙ;

СПАРТЫЎНЫ КОМПЛЕКС;

ШМАТЛІКІЯ ГУРТКІ І СТУДЫІ ФГП (факультэта грамадскіх прафесій).

Дарэчы, ФГП і студэнцкі клуб запрашаюць цябе ў:

АКАДЭМІЧНЫ ХОР;

НАРОДНЫ ХОР;

АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ;

ДУХАВЫ АРКЕСТР;

КАЛЕКТЫЎ НАРОДНАГА ТАНЦА;

СТУДЫЮ БАЛЬНАГА ТАНЦА;

СТУДЭНЦКІ ТЭАТР;

СЕКЦЫЮ СОЛЬНЫХ СПЕВАЎ;

ВІА;

СЕКЦЫЮ ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА;

АНСАМБЛЬ НАРОДНАЙ МУЗЫКІ;

ФОТАГУРТОК;

СЕКЦЫЮ ЭКСКУРСАВОДАЎ.

Юнакоў і дзяўчат чакае аператыўны атрад універсітэта. За даведкамі звяртацца ў камітэт камсамола ГрДзУ, або па тэл. 44-80-96.

ЮРЫДЫЧНАЯ ДАВЕДКА

З пытаннямі, якія, магчыма, зацікавяць першакурснікаў, мы звярнуліся да юрысконсульта універсітэта АЛЯКСАНДРА ЛЕАНІДАВІЧА БЕЛАВУСАВА.

— Якая гранічная нагрузка студэнтаў, што навучаюцца на дзённых аддзяленнях вышэйшых навучальных устаноў?

— Гранічная нагрузка студэнтаў усімі відамі вучэбных заняткаў, прадугледжаных раскладам, уключаючы факультатыўныя, не можа перавышаць на I-IV курсах — 36 і на V-VI курсах — 30 гадзін у тыдзень; пры чатырохгадовым тэрміне навучання: на I-III курсах — 36 і на IV курсе — 30 гадзін у тыдзень.

— Якая роля студэнтаў у кіраванні вышэйшай навучальнай установай?

— Студэнты дзённых аддзяленняў ВНУ прадстаўлены ў калегіяльных органах. Яны складаюць чвэрць Вучонага савета ВНУ (факультэта), а пры выбарах рэктара і дэканаў — больш за 25 працэнтаў Савета ВНУ (факультэта). Прадстаўнікам выбарчага студэнцкага актыву, старастам груп дазваляецца прысутнічаць на заліках, экзаменах, абаронах курсавых і дыпломных работ (праектаў) і ўносіць прапановы па ўдасканаленню практыкі іх правядзення. Яны прымаюць таксама ўдзел у рабоце камісіі па размеркаванню спецыялістаў, уносяць прапановы па фарміраванню плана размеркавання.

— Ці мае ўплыў меркаванне студэнтаў на выбары выкладчыкаў вышэйшай навучальнай установы?

— Так, безумоўна. Пры абранні на новы тэрмін па конкурсу выкладчыкаў, якія працуюць у ВНУ, вынікі штогоднага анкецірання «Выкладчык вачыма студэнта» паведамляюцца Вучонаму савету ВНУ, факультэта і ён улічвае вынікі гэтага анкецірання, так як і іх думку ў іншых формах (напрыклад, выступленне на пасяджэнні Вучонага савета, сходзе і г. д.).

— Каму са студэнтаў могуць быць устаноўлены індывідуальныя планы падрыхтоўкі?

— Рэктар па прадстаўленню выпускаючых кафедр можа ўстанаўліваць асобным студэнтам старэйшых курсаў індывідуальныя планы падрыхтоўкі. У іх, за кошт пераразмеркавання часу, прадугледжваецца паглыбленае вывучэнне асобных курсаў і раздзелаў дысцыплін, неабходнасць ведання якіх дыктуецца характарам будучай дзейнасці. Індывідуальныя планы падрыхтоўкі студэнтаў устанаўліваюцца ў межах тэрміну навучання.

— Якая роля студэнцкай групы пры назначэнні стыпендыі?

— Калектыў студэнцкай групы хадатайнічае перад стыпендыяльнай камісіяй аб назначэнні стыпендыі членам вучэбнай групы, якія маюць добрыя і здавальняючыя адзнакі, а таксама аб назначэнні надбаўкі да стыпендыі за актыўны ўдзел у вучэбнай, навуковай і грамадска-карыснай дзейнасці. Гэта надбаўка можа быць знята таксама па хадатайніцтву калектыву групы. Студэнцкая група вылучае кандыдатаў на прысваенне імянных і персанальных стыпендый Вучонага савета ВНУ.

БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

Сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня народзін беларускага паэта Казімера СВАЯКА (Кастуся СТАПОВІЧА), а мы яшчэ толькі пачалі друкаваць яго спадчыну. Віна гэтага чалавека, за якую ён быў адлучаны ад свайго народа, толькі ў тым, што паэт быў каталіцкім светаром. Увесь свой кароткі век Казімер Сваяк цярпеў уціск шавіністычна настроенага кіраўніцтва польскага Касцёлу, а па смерці не мог быць надрукаваны на Радзіме.

Часопісы і газеты ўжо пазнаёмілі з вершамі Казімера Сваяка. Мы ж прапаноўваем урыўкі з кнігі «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі», дзённіка, які вёў паэт праз усё сталае жыццё. Гэта імпрэсіі філасофскага характару, звернутыя да самога сябе, як бы другі бок паэтычнае творчасці. Зараз самы цвярозы рэаліст і скептык не стане адмаўляць вялікае значнасці маральна-этычнага вучэння М. Гогаля, незразумелага і ашальмаванага В. Бялінскім. Спадчына паэта-каталіка, у якой так яскрава выявілася беларуская ментальнасць, таксама чакае свайго месца ў нацыянальнай культуры.



Казімер Сваяк

ДЗЕЯ МАЁЙ МЫСЬЛІ, СЭРЦА І ВОЛІ

Ах, шчасьлівы той, што збудаваў сабе стройную, горную мінуўшчыну... Чаму я неспакойны, чаму бязвольны?!.

Дарагі! Сабяры сілы духа...Стаў прад сабой усё, што прайшло... Будуй новае, штораз высшае жыцьцё!..

Вось-вось ухваціць адзін праменьчык, пацешыся ім, разьясьніць цемру быту, аж зьяўляецца другі, трэці... і сілы ападаюць, аж маркоціца твая істота і малее, разумеючы, што кароткае жыцьцё Бог даў для пазнаньня, або, што пэўна ня тут нам угадаць усе тайнасьці быту,—трэба адмены цэлай істоты.

Дзіўныя нашыя вясковыя гульні. Здаецца мне—што мэта гульняў — гэта добры выпачынак па працы, ну і забаўка. Харошая гэта штука танцы, але небясьпечныя яны. Люблю глядзець на вясёлую маладзяж, што скача аж да поту, аж да ўпаду. Люблю стройныя і мэтныя жарты, мілыя вясковыя песьні. Але што ж! — Я ня маю чаго йсьці на вечарніцы да маіх вясковых сяброў. Грашаць там Бога, горшаць людзей. Ня ўся моладзь бяз стыду. Найчасьцей двух-трох найдзецца шалуськаў, яны перашкодзяць забаўляцца ўсім. Знойдзецца водка, а як яна, пачынаецца стыдная забава. Не хачу быць сьведкам чужых грахоў і блуду. Я хацеў бы на вечарынцы маладосьці жывой, вясёлай, але чыстай. Што ж тут адзін зробіш!.. Я разьмінаюся ўжо зі імі.

Для Бога няма прошласьці ані будучыні, ёсьць толькі цяперашчына, што цягам сваім абымае тры эпохі часу... Чым жа ёсьць час, у каторым мы трываем? Гэта мамэнты, пералётныя для нас нярухомыя для Бога... Чым жа ёсьць само жыцьцё чалавека? Гэта хвіліна, нязначная ў вечнасьці...

Мы неспакойныя, калі відзім хвіліны гэтай хуткі разьдзел на дробныя часткі, з каторых кожную завём годам, ставім вялікую рожніцу між жыцьцём 20, 30, 50, 100 гэтых дробных часткаў, гадоў. Балючая трывога нас агарняе, калі відзім, што ідзе апошняя наша гадзіна, трэба кончыць гэта жыцьцё, райсьці праз сьмяротны скон сэрца, што трэба пакінуць зямлю, кінуцца ў лона вечнасьці.

Чалавек... лётны пыл у нязьмерных прасторах, пункт на шырокім зямлі абшары, момант у цяглым разьмеры часу... А колькі ў яго заходаў, каб добра прыладзіцца на гэты кароткі сон жыцьця, каб напіцца кадзіла пахвалаў, што яму так дорага прадаюць другія людзі — попелы, пылінкі, як ён сам...

Істота дасканалая Езуса ў тым, што ўсе яго сілы духовыя і цялесныя ў найлепшай з сабой гармоніі, згоднасьці. Хрыстус жыў людзка: бываў на пачастунках, плакаў, гневаўся, а ніхто ня можа сказаць, што Бог-Чалавек у чым колечы быў замала цнатлівы, меней дасканалы, як хоць бы найбольшы сьвяты. Сьвятыя людзі былі дасканалыя найчасьцей толькі ў вадным якім-кольвек кірунку. Хрыстус усім, заўсягды, усюды множыў хвалу божую: кожнай сваёй мысьляй, кожным словам, кожным рухам.

Хочаш жыць зь людзьмі паводле волі божай — адрачыся свайго самалюбства. Падставай добрага жыцьця з бліжнім — гэта афярнасьць.

Агонь агнём, а гнеў гневам загашаны быць ня можа.

Шукай добрага ў бліжнім тваім. На благое не зьвяртай увагі.

Нашто думаць аб мінуўшчыне, або аб будучыне? Карыстай з той ласкі божай, каторую цяперака маеш. На думкі, што ніколі ня збудуцца, шкода часу.

Пакора — гэта тая пустасьць, у каторай ставіцца фундамент веры, надзеі і міласьці.

Міласьць у небе ёсьць цягам далейшым міласьці на зямлі. Яна ёсьць там скончанай і цэлай натуры чалавека: ён усёй істотай сваёй любіць Бога.

Нянавісьць пякельная ёсьць цягам нянавісьці земскае. **Вораг Бога на зямлі астаецца ворагам Бога па сьмерці.**

Ня губі духовай радасьці, калі ў жыцьці спатыкаеш толькі церні. Ідзі ўслед боскага мучаніка Хрыстуса.

Бяруся ізноў за рэформу свайго характару... Сьцеражыся адмовы, антыпатыі. Сьмешнае адкрыцьцё! Я ня цярплю тых, у кім віджу свае ўласныя недахопы. Трэба маліцца за тых, каго чымкольвечы абразіў, або каго ня люблю. Гляджу на аднаго калегу — ён усім мілы, улёсьлівы. Колькі ў ім гатовасьці адрачыся свайго права, колькі спрыяйнасьці ў кожным руху, у кожным мілым усьмешку... Аднак здаецца мне, што мне такі дар быў бы небясьпечным. Я палюбіў бы таварыства, візіты, пустасьць сьвету. Мая нясьмеласьць і «простасьць» усьцерагла мяне ад многа ўпадаў. Астаецца адно: **быць сабой і старацца характар зрабіць сільным, цьвёрдым, да афяры скорым.** Трэба мець сэрца, адданае міласна цэламу грамадзянству, асабліва бедным і крыўджаным. Такая міласьць пакажа што рабіць. Ня буду ніколі скупым самалюбам...

Рух палітычны ці наогул грамадзкі мае падклад этычны, дык у такіх перасіленьнях, якія мы перажываем, ці можа быць душа чалавека спакойнай? Адраджэньне мовы нашае і то мае сувязь з справамі этыкі, бо ці ж падклад яго ня вяжацца з пытаньнем: «можна, нельга?» Сацыялізм ня можа ня ўмешвацца ў справы натуры рэлігійнай, бо этыка і рэлігія — дзьве сёстры неразлучныя і абедзьве ў натуры чалавека. Мы павінны дайсьці да выснаву, што калі адкінем хрысьціянства з руху нашага народнага, то ён, гэты рух, расплывецца ў золкай міжнароднасьці і этычнай разьвязнасьці. «Не пакідайма мовы роднай, каб ня ўмёрлі. Не пакідайма рэлігіі глыбокай, каб не загавець душой...»

Буду пісаць **па-беларуску.** Мова беларуская ёсьць гладкай і згучнай: можа служыць і да паэзіі (але сам сябе я да паэтаў залічыць ня важуся) Пастараюся выгладзіць стыль свой беларускі. Згодзіца ў будучыне.

А кожны сьвятовы пераварот каштуе мільёны людзей. Як гэта сумна, што чалавек, істота разумная, ня можа змагчы найвялікшага зла на сьвеце — вайны. Бясьсільны ён тут, а лепей скажам **подлы.** Жыцьцё людзкое ёсьць найцаньнейшым дарам божым. Да чуцьця, як пэўнай формы быту — кіруюцца ўсе творы. Мусім шанаваць жыцьцё нават малога жучка, бо права да яго згубы мы ня маем. Адабраць жыцьцё чалавеку — гэта праступак, каторы толькі Бог помсьціць можа дастойна. Вайна ёсьць згуртаваньнем усіх праступкаў. Яна ёсьць ганьбай чалавечнасьці. Яна матка ўсялякай нядолі. Няма нічога на сьвеце так паніжаючага чалавека, як вайна. Роўнай пагібелі, што нясе яна людзкасьці, не знаходзім у зьвяроў. Бог дапушчае такое зло на сьвет, каб зьніжыць пыху людзкую. Ня Бог прычына вайны — злосьць людзкая, завісьць і пыха. Што Бог дазволіў, каб кроў лілася,— ня дзіва. Вольнай волі чалавека ён не касуе. А між людзкой злосьці і нянавісьці патрафіць аказаць сваю найвышэйшую ўладу і справядлівасьць...

Я сын таго народу, што найболей цярпеў, цярпіць і цярпець будзе. Цярпеньня хачу, але такога, каторае зь мяне зрабіла б чалавека стальнога характару. Народ наш вялікі, а лічыцца найменшым. Няхай і я — сын яго — такім буду. Народ наш нешчасьлівы бяз сучаснасьці пэўнай, бяз будучыні яснай — але глыбокі у жыцьці сваім ціхім, сьпеўным. Няхай і з маім так будзе жыцьцём: глыбокасьць духа, шырокасьць сэрца, агонь мовы і песьня, песьня тайнічная, бязьмерна сумная, хоць **вечнай спадзеяй жывая.**

Баліць мне сэрца, як чую жаргон тых, што хочуць кінуць мову родную на карысьць чужой. Але я ніколі ня кідаўся сваім поглядам на гэту справу. Магу я мыліцца пад тым узглядам, што беларуская мова заваюе сабе права між народу, але ніхто мяне не пераканае, што быццам мы гаворым расейскім жаргонам. Гэта праціўна і нашай гісторыі і нашаму бытавому пачуцьцю.

О, злосьць гібучая, сьляпая ты страшэнна! Так заўсёды: што чалавек правай рукой збудуе, левай стараецца зьвярнуць — і то ў імя лепшай будучыні... іронія! Казаў бы за мора сьлёзаў крывавых можна купіць сабе шчасьце!..

«Гоман» Віленскі ясна даводзіць патрэбу абуджэньня уніі — «адвечнай веры бацькоў нашых».Багаслаў, Божа!..

Літвін пазнае беларуса па яго бацькаўскай мове, Паляк кажа, што хто мовіць пацеры ў ягонай мове, той Паляк. Гэта нелёгічна і нова. Даўнейшая «оріпіа» судзіла іначай. Зьвязь з пальшчынай відочна рвецца. Дружба зь Літвой зацясьняецца ўсё мацней. Так і быць мусіць. Заплакаў бы Міцкевіч, каб увідзеў, як «народ», у яго паняцьці, дзеліцца...

Пакора бароніць ад найгоршай хваробы характару, ад бязьверра, каторае ёсьць затратай пачуцьця адказнасьці перад Богам. Пакора асьцерагае прад самалюбствам, навучаючы, што ты ня лепшы за другога, а затым мусіць мець выразумеласьць для людзей і пашану. Пакора бароніць ад неахвоты і роспачы, бо дае зразуменьне слоў Хрыстуса: «Безь мяне нічога ня можаце».

Адзін Касьцёл Божы Міласьці—і адзін збор шатанскі нянавісьці. Насупроціў... слова Божае: 'Fiaf lux' — стань сьвятло — і слова Ягонае: 'Ecce nova facio omnia' — чыню ўсё нанова — становіць два бакі адной карты бытаваньня істот разумных.

Гісторыя сьвету — гэта гісторыя пыхі анёлаў і людзей. Пакора называе Бога панам сваім, пыха сябе ставіць на мейсцы Бога. Пакора хваліць Быт, пыха ніштосьць. Пакора вывышшае, пыха зьніжае. Шчасьце, за каторым гнаўся род людзкі — гэта **Сам Бог.** Няшчасьце, каторае выбраў сабе першы і апошні грэшнік, гэта разлучнасьць з Богам. Шчасьлівы чалавек, каторы ўмее сказаць: «Бог мой і усё маё!»

Мой Божа! Чую я падзячнасьць за тое, што мысьль мая — маўляў каля вялікага цэнтру,— круціцца каля вечнае ідэі: 'Deo servire regnare est' — служба Богу,—гэта панаваньне... Я хацеў бы знайсьці якуюсь сынтэзу жыцця свайго... Але нашто? Якая можа быць сынтэза жыцьця, каторае толькі гарэла само ў сабе, не выдаючы ясьнейшага полымя на сьвет? Якая аднак сынтэза кожнага жыцьця, што вось тут пад крыжам знайшло свой часовы канец?.. Можа б гэту сынтэзу аднялі словы: «Спазнаў, чым ёсьць крыж і праз цярпеньні знайшоў Бога». Я ахвотна напісаў бы гэта на пліту грабавую табе, чалавеча.

Бяда толькі, што народ наш ня мае найменшае дозы крытыцызму, калі яму суліць Польшч усё, ня выключаючы і... 'Krolestwa Niebieskiego'...

Салавейка штонач спаць не даець думкам збуджаным. Цудныя ночы. Раскошныя дні. Толькі сэрца так ные, так плача, моў бы не стаець яму чагось. Я не хачу абніжыць сваіх намэтаў горных. А сэрца так ціскаецца. Хоць ты кінься куды, каб уцячы ад самога сябе!..

Езу! Я помню, што цярпеньне — маці творчасьці.

Ах, гэты май; гэты цудоўныя чары ночы, у каторых можна ўсё зьведаць і ўсё...згубіць. Як жа было б шчасьліва на зямельцы, каб зьніштожыць на ёй эгаістычныя сэрцы! А кожнае шчасьцейка так дорага каштуе — каштуе столькі сьлёз... гора. Няма на сьвеце трываласьці ў нічым. Усе яго вартасьці няцэнны. Каб ня было б іншага жыцьця, ня варта было б прыходзіць на даліну цярпеньня...

Атмосфэра законьнікаў акружае мяне. Арыгінальны меў сон, у каторым я гіну з рукі ўсходняга свайго нібы брата, між двух праціўных ідэолёгіяў (сымбалізаваных у двух містычных кірунках), пакінены нават бацькамі, каторых прашу (як нябошчык) справіць хаўтуры.

Псыхіка ў сьне сымбалізуецца дзіўна: расказваць сны — гэта тое самае, што адкрываць сябе.

Жыцьце маё — гэта толькі дробны эпізод у існаваньні маім. Як лёгка аднак паверыць у прээгзыстэнцыю. Ці ж Бог паводле «Бібліі» не «ўдыхнуў» у цела **духа!!** Значыць зь сябе даў **нешта.** Сапраўды «зь нічога» можа толькі «нічога». І нерэальнасьць зьявішчаў матэрыяльных можа быць даказанай. Нават можна паверыць Гегелю, што быт (матэрыяльны) і нябыт ідэнтычны. Жыцьцё гэта толькі адзін з многіх спосабаў праявы самасьведамасьці духа, каторы актам творчым адвечнай Божае любові выяўляе сябе ў форме часу і прасторнасьці. Той сьвет і гэты сьвет неразьдельны, а сьвет сьвет нераздзельны, а сьвет духа больш пэўны, чым сьвет Езус няхай жыве ў ва мне!

Публікацыя Ю. ПАЦЮПЫ.

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-71-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 7462

Тыраж 2000 экз.

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.